Цана асобнага нумару 20 гр. | Pierasyłka apłačana ryčałtam

№ 16 | Вільня, Субота 9 Траўня 1931 г. | Год VII (XV)

Беларуская КРЫНІЦА

Палітычная, Грамадзкая і Літэратурная Газэта.

Адрас Рэдакцыі і Адміністрацыі:
ВІЛЬНЯ, Людвісарская 1-19. (Wilno, Ludwisarska 1-19)
Рэдакцыя адчынена ад 9 гадз. ран. да 4 гадз. веч.

Цэны абвестак паводле ўмовы.

„Бел КРЫНІЦА" каштуе на год—4 зл., на паўгода — 2 зл., на 3 месяцы — 1 зл.. Заграніцу ўдвая даражэй.
ГАЗЭТА ВЫХОДЗІЦЬ РАЗ У ТЫДЗЕНЬ.

MOKSLŲ AKADEMIJOS BIBLIOTEKA

У справе рэлігійнай уніі.

Прыезд у прошлым месяцы ў Вільню ўвіяцкага біскупа Чарнэцкага паставіў на парадку дня, ужо невядома каторы раз, справу уніі. Гэтая справа, як мы ўжо казалі, вельмі важная для беларускага народу і жывая. Яна родзіцца, памірае і ізноў аджывае ў працягу цэлых вякоў.

Два дзейнікі спрычыняюцца да гэткай жывучасьці уніі: дзейнік рэлігійны і дзейнік палітычны. На добрых хрысьціян большы ў гэтай справе мае ўплыў дзейнік рэлігійны, а на палітыкаў — дзейнік палітычны.

Добрыя хрысьціяне, ці гэта будуць заходнія (каталікі), ці ўсходнія (праваслаўныя), заўсяды сумавалі над падзелам адзінага хрысьціянства, якое ў 1054 годзе падзялілася на дзьве часьці: усход і заход, праваслаўных і каталікоў. Добрыя хрысьціяне заўсёды імкнуліся да таго, каб гэтыя дзьве часьці, так блізкія да сябе ў справах догматаў, каторыя праз тысячу гадоў былі разам, злучыць ізноў у адно. Процiў гэтага чыста рэлігійнага імкненьня ніводзін добры хрысьціянін,—ні каталік, ні праваслаўны,—мець нічога ня можа—і мы бачым, як з аднаго боку, так і з другога людзі добрай волі шукаюць спосабаў гэтага злучэньня.

Але апроч гэтага, рэлігійнага, дзейніка ёсьць дзейнікі і палітычныя. Беларусь ляжыць паміж усходам і заходам, на рубяжы рэлігійнага падзелу. З аднаго боку рубяжа ляжыць „заходняя каталіцкая" Польшча, а з другога боку усходняя, праваслаўная Расея. Паміж гэтымі „суседзямі" йдуць змаганьні за Беларусь і Украіну — і ня толькі за зямлю, але за народы,—і ня толькі за народы ў фізычным разуменьні, але і псыхічным. Ідуць змаганьні за душу гэтых народаў. А як жыцьцё душы найболей праяўляецца ў жыцьці рэлігійным, то змаганьне йдзе за рэлігію гэтых народаў.

Гэтае змаганьне пачынаецца бадай ад 14 стагодзьдзя, калі Польшча кідае свой „Drang nach Westen" у нямецкія землі, а пачынае праводзіць „Drang nach Osten" у землі ўсходніх славян, дэзарганізаваных нападамі татар і ўласнымі спрэчкамі. Гэты „Drang nach Osten" прыводзіць да палітычнай уніі ў Любліне (1569) і да рэлігійнай—у Берасьці (1596).

Але, на жаль, гэта рэлігійная унія ў Берасьці была таксама, а можа яшчэ болей, палітычная, чым тая першая ў Любліне. Берасьцейская унія, паводле польскай палітыкі, мела прылучыць душу беларускага і ўкраінскага народу да Польшчы і ўніяцкі, усходні абрад меўся быць толькі пераходным этапам, як-бы памостам, да лацінскага абраду і разам з гэтым да польшчыны. Дзеячы гэтай уніі мала, або і сусім не зварочвалі ўвагі на рэлігійнае ўсьведамленьне народу, яны стараліся рабіць польскую палітыку і пашыраць польскую культуру.

Ясная рэч, што Расея, здабыўшы беларускія і ўкраінскія землі, пачала рабіць якраз наадварот, але мэтодамі выпрабаванымі Польшчай. Знашліся і адпаведныя біскупы, і сыноды, і пастановы далучыцца да „праваслаўнай" царквы і г. д. Адно толькі ўвялі новае: далучаным да расейскага праваслаўя не гаварылі адкрыта аб далучэньні; гэту справу пакідалі на старане з тэй думкай, што час прыдзе на помач і яны некалі ўсьведамяцца ў сваім праваслаўі...

* * *

Зрабіўшы гэты кароткі агляд падзеяў уніі ў мінуўшчыне, мы пярэйдзем да падзеяў цяперашніх.

Гісторыя паўтараецца. Як даўней, так і цяпер Польшча хацела-б на занятых ей беларуска-украінскіх землях правясьці унію. Унія палітычная была зроблена ўжо ня ў Любліне, а ў Рызе (часткова ў Вільні), на аснове якой часьць беларускіх і ўкраінскіх зямель была далучана да Польшчы. Асталося на гэтых землях зрабіць яшчэ унію рэлігійную, падобную да даўнейшай Берасьцейскай. Праводжаньне гэтай уніі было даручана польскім біскупам, якія і пашлі па выпрабаваных даўней шляхох.

Аднак-жа цяпер у 20 стагодзьдзі абставіны „трошкі" іншыя, чым былі ў 17 ст. На сцэну вышлі два народы, якія дагэтуль былі ў нацыянальным летаргу: беларусы і ўкраінцы. Польскі і расейскі палітычныя, дагэтуль суседзкія, дзейнікі спаткаліся з дзейнікамі: беларускім і ўкраінскім. Суседзі — палякі і расейцы — пачуліся разьдзеленымі і „суседзкія" зносіны свае прымушаны рабіць праз беларусаў і ўкраінцаў. Згэтуль паўстала яшчэ большае змаганьне за ўплыў на гэтыя народы, змаганьне за душу гэтых народаў.

Але якім спосабам праводзіць гэтае змаганьне?

І тут прышлі на помач старыя, ужо выпрабаваныя, мэтады. Даўней, калі просты народ ня меў ніякага голасу, ані ў палітычных, ані ў рэлігійных справах, найбольшую ўвагу нашы „суседзі" зьвярнулі на наша баярства і інтэлігенцыю. Насьледкі гэтай „увагі" былі нязвычайныя,—такія, якіх можа не спадзяваліся нават самі нашыя суседзі: усё наша баярства і інтэлігенцыя пакінулі свой беларускі народ і прынялі веру і народнасьць нашых суседзяў. Гэтакая работа праводзіцца і цяпер: усіх выдатнейшых сыноў нашага „простага" народу „суседзі" стараюцца перацягнуць на свой бок рознымі спосабамі.

Але гэтага мала — гэта йшчэ ня ўвесь народ, а толькі адзінкі. А каб пацягнуць увесь народ, трэба іншых, болей масавых спосабаў, а такім масавым спосабам ёсьць рэлігія. Але аб гэтым у наступным нумары нашай газэты.

З Беларускага жыцьця.

Беларускае пачатковае школьніцтва пад Польшчай. Паводле афіцыяльных даных польскіх школьных уладаў, беларускае пачатковае школьніцтва пад Польшчай выглядае вось так:

Беларускіх урадавых пачатковых школаў з беларускай мовай навучаньня ў сёлетнім 1930-31 школьным годзе налічваецца 21, утраквістычных ці г. зв. двуязычных 41.

І гэта ўсё, што беларусы маюць ад польскага ўраду ў галіне народнай прасьветы.

А трэба ведаць, што беларусы ў 1926 годзе падалі больш 20.000 дэклярацыяў, дамагаючыся адкрыцьця 412 пачатковых беларускіх школаў з беларускай мовай навучаньня. Апрача гэтага кожны год беларусы, паводле г. зв. языковага закону, засыпалі польскія школьныя інспэктараты сваімі дэкларацыямі з дамаганьнем адчыненьня для беларускіх дзяцей беларускай пачатковай школы.

Вынік змаганьня беларусаў за родную школу, якое праводзілася ў працягу 4 гадоў, г. зн. ад часу стварэньня школьнага закону для нацыянальных меншасьцяў да часу дэкрэту Прэзыдэнта Польшчы, стабілізуючага польскае школьніцтва на нашых землях, які аднача́сна ўтрымлівае разьвіцьцё беларускага школьніцтва,—вельмі слабы. Беларусы ў працягу гэтага часу „выпрасілі" ад польскага ўраду толькі 21 школу з беларускай мовай навучаньня і 41 школу польска-беларускую.

Пры гэтым не адрэчы будзе разглядзіць і самую сетку гэтага беларускага школьніцтва.

Мы маем прад сабою статыстыку беларускіх школаў Віленскага Школьнага вокругу. Паводле гэтай статыстыкі ці падлічэньня беларускія пачатковыя школы раськінуты па ўсей тэрыторыі Віленскага школьнага вокругу на тэрыторыі Беларусі пад Польшчай:

Школы з беларускай мовай навучаньня ў паветах: Дзісьненскім — 2, Вялейскім — 7, Нясьвіскім — 1, Наваградзкім — 6, Слонімскім — 3, Стаўпэцкім — 2, разам — 21.

Школы утраквістычныя ці польска-беларускія ў паветах: Дзісьненскім — 7, Браслаўскім — 2, Вялейскім — 7, Баранавіцкім — 3, Нясьвіскім — 2, Пастаўскім—1, Стаўпэцкім — 3, Слонімскім — 2, Наваградзкім — 7, Маладэчанскім — 6, Вільня — 1, разам — 41.

З гэтае статыстыкі мы бачым, што і польскія ўлады знашлі беларусаў над Дзьвіной, Нёмнам, Шчарай і Вяльлёй, дзе для іх адважыліся адчыніць некалькі школаў з беларускай вывескай. Аб беларускасьці-ж гэтых школаў арганізаванае беларускае грамадзянства амаль сусім нічога ня ведае. Няведамыя беларускаму грамадзянству так-жа і вучыцялі гэтых школаў. Дзеля гэтага зьвяртаемся да чытачоў нашых суседуючых з гэтымі школамі з просьбай паведаміць нас дакладна аб гэтых школах, аб іх беларускасьці і аб вучыцялёх гэтых школаў.

Агульны сход Беларускага Студэнскага Саюзу ў Вільні. У нядзелю 3 траўня с. г. адбыўся гадавы агульны сход Б.С.С. ў Вільні. На гэтым сходзе адбыліся: справаздача Рэвізыйнай Камісіі, перавыбары уладаў Б. С. С. і разгледжаньні некаторыя справы меншае вагі.

Перад справаздачай Рэвізыйнай Камісіі было адчытана прывітаньне Беларускаму Студэнству ад Другой Краёвай Студэнскай Украінскай Конфэрэнцыі Заходне-ўкраінскіх Земляў. Прывітаньне прынята гучнымі воплескамі.

Рэвізыйная Камісія ў справаздачы з дзейнасьці Ўраду Б.С.С. за 1930-31 акадэміцкі год сьцьвердзіла:

1) што быўшы Урад Б. С. С. за далёка пасунуўся ў кірунку палітыканства.

2) што быўшы рэдактар „Студэнскай Думкі" Ст. Станкевіч за многа выказваў „самадзейнасьці", ня пытаючыся на гэта згоды Рэдакцыйнай Калегіі.

3) што касовасьць і канцэлярыя вялася нездавальняюча.

4) што стыпэндыі часта былі прызнаваны адзінкам, менш патрабуючым дапамогі.

Агульны сход, выслухаўшы справаздачу Рэвізыйнай Камісіі, прыступіў да нарады над абсолютарыюмам старому Ураду Б. С. С. Пасьля дыскусіі агульны сход пастанавіў: даць старому Ураду Б.С.С. абсолютарыюм з вывагарам за нязгодныя з ідэолёгіяй Б. С. С. адміністрацыйныя і арганізацыйныя паступкі.

Па заканчэньні справаздачы Рэвізыйнай Камісіі агульны сход прыступіў да перавыбараў Ураду Б. С. С. на 1931-32 акадэміцкі год.

На старшыню аднагалосна, праз аклямацыю, выбраны Барыс Арэнь; на сяброў Ураду: А. Гаўрылічанка, Я. Кепель, В. Тумаш, і Я. Клагіш; на заступнікаў: Б. Чурыла і М. Пяцюкевіч.

У Рэвізыйную Камісію выбраны: на

старшыню — Я. Шутовіч; на сяброў: М. Скурчанка і П. Хваль.

Рэдактарства „Студэнскай Думкі“ агульны сход даручыў М. Тулейку, які дабярэ сабе Рэдакцыйную калегію.

„Mane, tekel, fares“

У часе галасаваньня нехта разам з картачкай голасу падаў пісульку з гэткімі зловарожачымі біблійнымі славамі. Сьпярша гэты надпіс многія студэнты розна тлумачылі, ня могучы згадаць, у каторы бок ён ськіваваны, але пасьля падлічэньня галасоў выясьнілася, што гэтае біблійнае „Mane, tekel, fares“ прадсказвала лёс „санацыі“, якая імкнулася да апанаваньня Бел. Студ. Саюзу.

Санатары, якіх налічваецца каля дзесятка, ня змогшы правясьці аніводнага свайго прадстаўніка ў Урад Б. С. С. імкнуліся апанаваць Рэвізыйную Камісію, але імі гэтага зрабіць не ўдалося.

Маладыя полёнафілы, убачыўшы свой правал і дашчэнтную кампрамітацыю, „дэманстрацыйна“ выйшлі пасьля ўсяго з салі сходу, пад акампаніямант бурных воплескаў аграмаднае большасьці студэнства.

Чарговым пунктам у парадку дзенным сходу была справа Апякуна Б. С. С. Сход пастанавіў: 1. выразіць шчырую падзяку праф. Ст. Владычку за яго апеку над Б. С. С. у мінулым акадэміцкім годзе і 2. запрасіць гэтага-ж прафэсара на апякуна на наступны 1931-32 акадэміцкі год.

Пасьля разгляду бягучых спраў, агульны сход Б. С. С. закончыў свае нарады грымучым сьпевам „Ад веку мы спалі“.

Новаму Ураду Б. С. С. жадаем плоднай і карыснай працы на карысьць нашай Бацькаўшчыны.

Паседжаньне Прэзыдыюму Беларускай Хрысьціянскай Дэмакрацыі. Дня 5 г. м. адбылося паседжаньне Прэзыдыюму Б.Х.Д., на якім між іншымі справамі унутранымі партыі, пастаноўлена склікаць зьезд дэлегатаў партыі Б. Х. Д. не пазьней, як у месяцы лістападзе сёл. году.

У 5-ую гадаўшчыну сьмерці Беларускага паэта К. Сваяка дня 6-га г. м. адбылося жалобнае набажэнства ў касьцеле сьв. Мікалая ў Вільні.

Звальненьне з вастрогу сяброў і працаўнікоў Галоўнай Управы Т-ва Беларускае Школы. У мінулым тыдні звольнены з вастрогу старшыня Т. Б. Ш. адвакат Стэцкевіч і працаўнікі: Паўловіч і Шырма. Д-ра Марцінчыка ўлады яшчэ ўсё трымаюць у турме.

Апэляцыйны суд над „Змаганцамі“. Дня 5 г. м. у Вільні адбыўся апэляцыйны суд над засуджанымі 14 I. с. г. Віл. акружным судом: Дварчанінам, Гаўрылікам, Крынчыкам і Валынцам на 8 гадоў катаргі, Жыткевічам, Пяткуном і Астапчыкам па 4 гады катаргі, Тарасюком, Міськам, і Лукашыкам па 2 гады вастрогу. Апэляцыйны суд, апраўдаўшы С. Жыткевіча, прысуд акружнога суду ў адносінах да іншых зацьвердзіў.

Гадавы сход сяброў Беларускага Коопэратыўнага Банку ў Вільні адбыўся дня 16.IV с. г. Агульны сход, старшынёй якога быў Вячэслаў Багдановіч, выслухаўшы справаздачу з дзейнасьці банку, выбраў у Наглядную Раду банку: Паўловіча, Кепеля, Кузьміна, В. Багдановіча, Карузу і Марцінчыка.

З БЕЛАРУСІ ПАД САВЕТАМІ.

„Калгасныя“ двары бяз коняй. Як ведама, камуністы двароў не чапалі і дворнай зямлі сялянам не раздавалі, а ў дварох залажылі „прыкладныя“ камуны, ці як яны называюць — „калгасы“, або „саўгасы.“ Да гэтых двароў сілай заганяюць сялян у камуну, далучаючы да такога „калгасу“ і зямлю сялянскую. Ад гэтага пэўне-ж двароў — „калгасаў“ не памяншаецца і яны не драбнеюць. Памяншаецца ад гэтага толькі лік гаспадарак сялянскіх, якія бальшавікі з кожным годам касуюць прылучаючы да „калгасных“ двароў і заганяючы аружжам гаспадароў у камуну.

У сёлетнім годзе ў гэтых „калгасных“ дварох прыходзіцца „камунарам“ араць хіба людзьмі, бо на такі вялікі двор няма нават і аднаго каня, а трактараў — машынаў для воркі бальшавікі яшчэ прыдбаць ня „ўсьпелі.“

Камуністычная газэта „Зьвязда“ з дня 20.IV.1931 г. піша, што ў дзень 1 студня с. г. з усяе камуністычнае рольнае гаспадаркі ў Б.С.С.Р. на адзін двор прыпадала 0,78 каня, у дзень 1 лютага 0,74 каня, на 1 сакавіка 0,68 каня і на 10 красавіка — 0,64 каня.

Ня піша толькі „Зьвязда“, якая гэтаму прычына, што кожны месяц драбнела частка каня ў камуністычным двары. Ня ведама, ці з кожным месяцам павялічваўся лік „калгасных“ двароў, ці проста здыхалі коні.

Але не пра тое камуністам ідзе, яны цяпер у хлопатах, што няма каму цягнуць плугоў і боронаў, а тут і вясна прышла і сеяць трэба, хоць ты людзей у плуг запрагай або курыцай барануй. Дык вось і падае сыгналы „Зьвязда“ заклікаючы да „рашучага бою“ за „конскую цягавую сілу“ дараджаючы „неадкладна абагуліць коні, якія знаходзяцца ў індывідуальным карыстаньні.“

Далей тая-ж „Зьвязда“ дамагаецца рэпрэсіі адносна тых сялян, каторых у гэтую зіму загналі ў камуну, каб яны давалі каней, заяўляючы даслоўна — „Патрэбаваць ад калгасьнікаў, якія перад уступленьнем разбазарылі коняй, каб апошнія купілі коняй, або здалі грашыма кошт каня ў калгас.“

Нічога, добрая гаспадарка ў „калгасных“ дварох. Але „горача“ і беларускаму селяніну папаўшы ў такі двор пад „апеку“ камуністычных цівуноў!

З Літоўскага жыцьця.

Праф. М. Біржышка, які некалькі месяцаў быў у Амэрыцы, дзе навязаў, між іншым, лучнасьць і з беларусамі, вярнуўся ў Літву.

Літоўская энцыклёпэдыя ўжо пачынае выходзіць з друку. Праца каля яе поўнага апрацаваньня і выданьня ідзе хутка ўперад. Першы том на літэру „А“ ужо выйшаў з друку і рассылаецца падпісчыкам.

Зьезд студэнтаў літвіноў, латышоў, эстаў і фінаў адбудзецца ў Коўне ў месяцы чэрвені сёл. году.

Праект вялізарнай электроўні. Апошнім часам у Коўне між местам і электроўняй паўстала непаразуменьне, у выніку якога паўстаў праект збудаваць новую, вялізарную электроўню коштам 60 мільёнаў літаў.

* * *

Абнаўленьне банку. 14 мін. месяца адбыўся у Вільні агульны сход сяброў Літ. Кооп. Банку, на якім выбраны новы ўрад банку, старшынёй якога астаўся П. Каразія.

Абнаўленьне Літ. Дабрадзейнага Т-ва так-жа наступіла два тыдні таму. На сходзе было 60 сяброў. На старшыню абабраны кс. К. Чыбірас.

Надзвычайны сход Літ. Навуковага Т-ва адбыўся 3.V с. г. На сходзе гэтым былі абгавараваны прадусім арганізацыйныя справы Т-ва і купля ўласнага дому, дзе можна было-б памясьціць бібліатэку і музей. Справа куплі дому даручана прэзыдыюму.

З Украінскага жыцьця.

Суд ад украінскім паслом, які адбыўся ў мінулым месяцы ў Роўне, засудзіў б. пасла І. Лішчынскага на 2 гады цяжкай турмы. Абарона Лішчынскага на гэты прысуд падала апэляцыю.

Kaz. Swajak.

Kupalle *). 2)

Fantazija — misteryjum, snawanaja na biełaruskaj mitolohii.

Źjawa 3.

Mokša — Niastydny wašy wočy,
Mužyčy wašy sercy...
Ja wyhaniu praročy
Twoj duch, Swaroh! —
Nia budzieš užo mieci
Ni Krali ni adzieży —
Proč mnie z dwara, ładača!
(*Da Krali*) — Ciabie-ž ja u Rubieży
Strybohu pasyłaju
I žonkaj naznačaju —
Malisia tam harača!
Swarožyk i Krala — (*kłaniajucca ŭ nohi*):
Jaśniejšaja pani, ciabie molim ščyra,
Kab nas nia hubiła, nadziei nia brała:
Tabie my słužyli, tabie spahadali,
Nia daj nam błahomu na łasku upyra;
Stryboham błahoje zusillo spanawała,
Nia daj nam zahinuć, kab na wiek prakli-
[nali!
Mokša — Mizernyja niamrawy,
Proč ad mianie idzicie!
Bierahinia — O pani, budź łaskawa!
Swaroh moj luby... sława
Dažbohu... ach puścicie!
Mokša — Astaŭsia!.. Proč, Swaroža!
Bierahinia — Ja z im až da mahiły.
Swarožyk — Tak pomni, o pani, i ty mocny
[Boža,
Swar.-Bierahinia — I ty mocny Boža, što
[świetam kiruješ!
Swarožyk — Ciabie pomścić, pani, siakiera
[waroža —
A pomstu maju ty zapozna pačuješ...
(*Adchodzić z pahrozaj*)

Źjawa 4.

Stryboh — Mnie hordamu carawu synu
Pakorna ludzkaja afiara...
Ciabie ja, dziaŭčo, nie pakinu,
Dar Mokšy prymaju... Dla cara
Ŭsio wolna twaryci — rabici...
Mokša — Tabie afiaruju dziaŭčynu,
Niawinnaść jaje paświačaju,
Za toje dabro, za skacinu,
Što ja ad ciabie daŭno maju.
(*adchodzić*).

Źjawa 5.

Bierahinia — Nia śmiej ty mianie, moj pa-
[nočku,
Na moment chacia začapici,
Bo ja ŭžo ŭ šluboŭnym wianočku
Z Swaroham kłałasia pražyci...
Stryboh — Što čuju?! Šče raz wiedać choču —
Ty śmiaješ praciŭnaj mnie byci!
Bierah. — Lublu ja Swaroha daŭnieńka,
Z twajho pažadańnia rahoču!
Stryboh — Taboj waładzieci-sudzici!
(*Čuwać hrom i piarun. Hołas Swaroha za scenaj).*

Źjawa 6.

Swarožyk (*za scenaj*):
O miłaja, ciabie ja nie zabudu
I wyruču ad złybiady, złej doli, —
Bo tak lublu, što zmahu ŭsiu abłudu
Piakielnaha byćcia... I dam tabie ja wolu.
(*Chawajecca za kamień z strelbaj*).
Bierahinia — O panie moj, damoŭ puści
[mianie ty,
Bo miły moj daŭno mianie čakaje,
Puści mianie! Ciabie ja nienawidžu
I ŭsio bahactwa, što ty mnie pasuliš.
Stryboh — Dziaŭčo! Majej ty budzieš, jak usie
]pradmiety
Majho bahactwa. Chaj ŭzdychaje
Twoj miły. Durnieńkaja, ja widžu,
Twaja hałoŭka... (*Skidaje jej wianočak*).
Bier. — Ty mianie zahubiš!
Stryboh — Tak! — jeśli nie palubiš...
Bierah. — Ciabie ja tolki nienawidzieć zdolna!
Stryboh — A moj prykaz... im budź dawolna.
(*Chapaje jaje za kasu. Razdajecca streł. Stryboh padaje. Bierahinia ŭciakaje i traflaje ŭ abojmy Swarožyka).*

DZIEJA III.

Bierah raki. Wałyń z liraj. Noč. Dažboh pahladaje łaskawa z chmaraŭ na ziamielku. Hulajuć rusałki.

Źjawa 1.

Chor — Dziewańki-lubańki,
Malinowy hubańki,
U zieleni kupajucca,
U krasačkach hajdajucca.
1 rusałka — Chłopčykaŭ čakali,
Wočki pramywali,
Kosy uplatali,
Sukni pajasali.
2 rusałka — U zialonaj dubrawie,
Na miakkaj murawie,
Lubku kałychali,
Kosku rasplatali
Chor — I na rečnaj fali
Rusałki hulali,
Maładych manili,
Na śmierć łaskatali

Źjawa 2.

Hołas Bierahini — O luby moj, iznoŭ z ta-
[boj žywu ja,
Razam z Swarožykam — Z taboj nikoli los
[užo nas nie padzielić,

*) Z paśmiertnaj, dahetul nihdzie nie drukawanaj, spadčyny aŭtara. Na rukapisie spatykajem hetkija dźwie zaciemki: „pisaŭ u złości, prasłuchaŭšy operu Maniuški — „Halka“ i „materjał na biełaruskuju operu. (Red.)

З загранiцы.

Сэсiя Лiгi Народаў. Дня 18 г. м. у Жэнэве пачнецца звычайная вясэньняя сэсiя Лiгi Народаў. Старшынёй гэтай сэсii будзе нямецкi мiнiстр заграмiчных спраў Курцiус. На парадку дня сэсii знаходзiцца больш 30 спраў, мiж каторымi i справа аўстрыйска-нямецкага мытнага саюзу, якi нарабiў стольки гоману ў Эўропе,— што быццам Нямеччына з Аўстрыяй аб'ядныюцца ў адну дзяржаву, а гэта пагражае сусьветнаму мiру, словам, вайна гатуецца. Гэтую сэсiю лiчаць найважнейшай ад часу, як паўстала Лiга Народаў.

На мейсцы аднае Гiшпанii фэдэрацыя 6 рэспублiк. Гiшпанскi мiнiстр справядлiвасьцi заявiў, што новы палiтычны лад Гiшпанii будзе абапёрты на фэдэрацыi шасьцi аўтаномных краёў: Каталёнii, Андалюзii, Галiцыi, Кастылii, Валенцыi, Краю Баскоў.

Няпрошаны камунiстычны ўрад арыштаваны. Як мы ўжо падавалi, III камунiстычны iнтэрнацыянал выслаў з Масквы гатовы камунiстычны ўрад для Гiшпанii, але гiшпанцы гэтых няпрошаных „уладароў" Гiшпанii спаткаўшы на першай станцыi сваей тэрыторыi — Iрунi арыштавалi i пасадзiлi ў турму.

Румынiя, як ведама, зьяўляецца саюзьнiцай Польшчы. Да гэтай пары ў Румынii народныя меншасьцi мелi такiя-ж самыя правы, якiя маюць не-палякi ў Польшчы. У апошнiя часы румынскi ўрад стварыў для народных меншасьцяў асобны мiнiстэрскi аддзел. Кiраўнiцтва гэтага аддзелу даручана правадыру нямецкай меншасьцi ў Румынii д-ру Брандэшу, якi будучы кiраўнiком гэтага аддзелу, зьяўляецца румынскiм вiцэ-мiнiстрам.

Як бачым, румынскi нацыяналiзм зьмякчэў i пашоў на супрацоўнiцтва з народнымi меншасьцямi.

Апостальская Сталiца выступае адкрыта процiў пагвалчаньняў правоў прыроды i паняволеньня жыцьця духовага народаў. Як ведама, Папа Пiус XI выступаў процiў пагвалчаньня рэлiгii i правоў натуры камунiстычнай уладай у С.С.Р.Р., а ў апошнiя часы выступiў i процiў пагвалчаньня правоў рэлiгii i фашыстоўскай уладай у Iталii.

Лекарскi аддзел.

Брушны тыфус.

Мэдыцына адрожнiвае тры сусём розныя хваробы званыя тыфусам. Хвароба, аб каторай хачу тут напiсаць некалькi слоў, называецца брушным тыфусам. А хачу напiсаць аб iм дзеля таго, што дайшлi чуткi аб новай эпiдэмii гэтай хваробы на нашых землях.

Брушны тыфус зьяўляецца хваробай **эпiдэмiчнай**, г. зн. што занядужывае на яго за раз заўсягды большы лiк асобаў жывучых блiзка ад сябе,— i **заразнай**, г. зн. што ад хворага, цi ад толькi што перахварэўшага можна набрацца гэтай хваробы. Трэба аднак зазначыць, што хоць тыфус i заразны, ад яго аднак можна ўсьцерагчыся, нават ходзячы каля хворага. Гэты гыгiенiчны ўзгляд на брушны тыфус, — як заховывацца, каб усьцерагчыся хваробы, а з другога боку ўзгляд санiтарны, — як заховывацца, каб спынiць пашырэньне эпiдэмii брушнога тыфусу,—будзе тэмай нашага разважаньня.

Каб адказаць на павыжшыя пытаньнi, мусiм ведаць: 1. што зьяўляецца прычынай хваробы, 2. скуль зародак хваробы бярэцца i 3. якiмi шляхамi ён распаўсюджываецца i трапляе ў людзкi арганiзм?

Прычынай брушнога тыфусу ёсьць бацыл, або так званая палачка брушнога тыфусу, выкрытая вучонымi перад 50-цю гадамi. Палачка гэта так малая, што звычайным вокам яе нельга ўбачыць. Размнажаецца яна дастаўшыся ў людзкi арганiзм нязвычайна хутка. Дастаюцца-ж гэтыя заразныя палачкi брушнога тыфусу з хворага на гэты-ж тыфус чалавека з ягоным калам, мачою, а часта i сьлiною, у вялiкiх колькасьцях. На шчасьце аднак гэтыя палачкi самi ў паветры ня носяцца i заразiцца iмi можа чалавек толькi тады, калi iх зьесьць.

З гэтага вынiкае, што каб не захварэць на брушны тыфус, трэба ўсьцерагчыся ад зьяданьня ягоных зародкаў, заразных палачкаў. Гэта аднак у заразных ваколiцах рэч вельмi цяжкая, а часта i сусём немагчымая. Лягчэй затое старацца, каб зьяданыя чалавекам тыфозныя палачкi былi ня жывымi, а забiтымi. — Найбольш тыфусовых палачкаў пападае ў рот чалавека разам з вадою. Пацьвердзiць гэта можа сялетнi факт, што як толькi вясьняныя брудныя воды перамяшалiся з водамi ў студнях, зараз-жа пачалася пашырацца зараза тыфусу. Вось-жа, каб забiць заразкi тыфусу ў пiтной вадзе, яе трэба прад тым у чыстай крытай **судзiне кiпяцiць (гатаваць) праз 15 мiнут** i такую ваду пасьля можна пiць сусём бясьпечна.

Але ня толькi самаю вадою можна заразiцца: можна заразiцца страваю прыгатаванай на сырой вадзе, лёдам, агурком, цi яблыкам, трапiўшым прад тым у сырую заражачую ваду, можна заразiцца рукамi, дакранаўшымiся прад тым, або да самога хворага, або да прадметаў меўшых з iм нейкую сутычнасьць, напр. нявыгатаваная па хворым пасудзiна, або хусьце (бялiзна).

Як з усяго гэтага бачым, ня трэба й нельга пiць сырой вады, асаблiва ў тых ваколiцах, дзе пануе тыфус. Асоба ходзячая каля хворага ня сьмее анi лазiць сабе ў рот з рукамi, анi есьцi штонебудзь, не памыўшы прад тым з мылам рук. Усякую рэч па хворым, як мiску, лыжку i г. д., можна ўжываць толькi добра яе прад тым выгатаваўшы.

Затрымаймося цяпер хвiлiну над тым, як належа пастулаць з **санiтарнага** пункту гледжаньня, каб перашкодзiць пашыраньню эпiдэмii брушнога тыфусу. Насамперш трэба ня пусьцiць у сьвет заразных зародкаў ад хворага чалавека, як ад галоўнага разсаднiка хваробы. Хвораму трэба даць знарочную (адумысловую) пасудзiну на кал, на мачу i на сьлiну. Усе выдзялiны хворага трэба засыпаць нягашанай вапнай у парашку i пакiнуць на некалькi гадзiн,— пасьля ўсё зьлiваць у ямы i засыпаць зямлёю. Хусьце ад хворага, прад тым, як мыць, трэба залiваць на 24 гадзiны 3-працэнтнай карболявай вадой. Салому з ложка па хворым, як ён устане, трэба спалiць, а з пасьцельным хусьцем пастулiць, як вышэй сказана. Трэба ведаць, што чалавек перахварэўшы на брушны тыфус даўжэйшы час яшчэ можа разсяваць заразныя палачкi i дзеля таго павiнен старацца не аддаваць калу i мачы дзе папала; асаблiва-ж не рабiць гэтага ў блiзкасьцi вады, якая можа заразу далей цi блiжэй разьнесьцi. Вялiкае значэньне ў гэтым выпадку маюць i студнi, з якiх бярэм ваду да пiцьця: студня павiнна быць так абмураваны, каб не трапляла ў яе вада з паверхнi зямлi i павiнна таксама быць закрытай зьверху.

Д-р Б. Грабiнскi.

З Польшчы.

Надзвычайная сэсiя Сойму, як падаюць газэты, мае быць склiкана на дзень 26 г. м. Урад падгатаўляе законы, якiя будуць пастаўлены на парадку дня гэтай сэсii, а iменна — самаўрадавая ўстава i iншыя.

Амнэстыя. Польскiя газэты падаюць, што ўрад мае аб'явiць амнэстыю. Толькi няма ведама, для каго яна будзе карыснай. Адны кажуць, што амнэстыя будзе для палiтычных праступнiкаў, памiнуўшы праступнiкаў камунiстычных, а другiя кажуць, што амнэстыя абойме толькi адмiнiстрацыйныя кары.

Ня можна бiць арыштаваных. На многiх судох жалiлiся вязьнi, што палiцыя вымушае зазнаньнi бiцьцём. Факты бiцьця палiцыяй арыштаваных на судовых працэсах у некаторых акружных судох пацьвердзiлiся. Дзеля гэтага галоўны камiсар палiцыi выдаў загад забараняючы палiцыi вымушаць зазнаньнi пабоямi. Цiкава, цi гэты загад дойдзе ў нашыя мястэчкi на пастарункi палiцыi.

З краю.

Пяруны—пажары—град. У мiнулым тыднi ў многiх мяйсцох нашага Краю бура нарабiла шкоды. У паветах: Браслаўскiм, Дзiсьненскiм i Вялейскiм ад пяруноў паўстала 6 пажараў. У Куранецкай гмiне, Вялейскага пав., пярун забiў 16 гадовага хлапца.

У Лiдзкiм пав. у ваколiцах Геранён i Лiпнiшак выпаў вялiзарны град, якi павыбiваў шыбы i папрабiваў крытыя паперай (папай) стрэхi. Град падаў вялiчынё курынага яйка.

Бомбавы тэрор. На станцыi Падбродзе хтось ў працягу аднаго тыдня ў мiнулым месяцы падкiнуў аж два разы бомбу, якая ўзарваўшыся забiла машынiстага. Прычына гэтага тэрору нявыясьнена.

Лiцытацыi фальваркаў. У м-цы чэрвенi ў ваяводзтвах: Вiленскiм, Наваградзкiм, Палескiм i Валынскiм адбудзецца 1812 лiцытацыяў фальваркаў, за якiя ўласьнiкi ўжо даўно пабралi грошы ў банку, а цяпер ня могуць аплацiць працэнтаў.

Choram z rusałkami — My razam znoŭ
[pracujem i harujem
I worah naš dzialić nas nie paśmieje.
Bierahinia — Jak wodnaj lalejcy ŭ čarocie,
Na świecie tak tužna sirocie,
Niawolnicaj kožny pichaje,
Bo biednieńka siły nia maje.
Šyroki na ŭźlot mach sakoli,
Jak lohka rusałcy na woli:
Stryboh nie asilić nikoli,
A Mokša skarana u poli.
Chor — Zarnica nam pyšna blisnuła,
Rusałka swabodu pačuła,
Ad radaści oddych spyniła,
Dažboh spahadaje nam miła.
Swarožyk — Ad mnohu let z niadoli bied
Tajkom minawali my trony,
Byŭ heta čas, kali ŭsie nas
Na ściah nahaniali čyrwony.
Stryboh upaŭ, kali-by ŭstaŭ,
Urad swoj padzielić miž nami,
A my pawiek — niama kalek —
Nia budziem niadoli synami.
Idzie na świet rusalny ćwiet
Da pracy swabodnaj na woli,
Idzie haroj naš prapar toj:
„Krywawy na čystym poli."
Chor — Minie niawola i aureola
Nam świecić ŭ žyćci na woli,
Ustań z spačynu, biary dziaŭčynu
Hulaci u čystym poli.

Źjawa 3.

Duchi Čornaha Boru — Žalnuju my pieś-
[niu zawodzim,
Naš śpieŭ ad žurby i hłumleńnia —
Bo my bieznadziejnaść znachodzim,
Hdzie ruń, hdzie rasćwietu natchnieńnie.
My duchi upadku ŭ niawoli,
Zor božy nia nam sudzić treba,
A tym, chto umieje pawoli
Dajści až rusalnaha nieba.
Pakuta pa tym, što sumnilis,
Choć možna było datrywaci —
Nikoli na žal nie zdabyliś
I možam my tolki psawaci.
Zestrašyć kaho u darozie,
Kab mety nia moh jon dabicca,
My sieli na bytu parozie,
Ni złom, ni dabrom nam sycicca.
Miž boru staroha źwiarami
Kazaŭ nam Dažboh miejsca mieci,
Dzialicca pakuty ślazami,
Až wiera paŭstanie na świecie.
Chor — Wialij sławaj Dažboža, —
Zor naš blesk Twoj trywoža
U im čytajem tajnicu prabytu —
Dzień sławy!
Paŭstawańnie ŭsieświetu —
Wiaśnie radaść, žar letu —
Twajej łaskaj usio addychaje —
Dzień sławy!
I ludzkaja ziamlica —
Świetawida imhlica —
Twajej twōrčaści tchnieńnie pačuje —
Dzień sławy!
(Pajaŭlajucca chłopcy i dziaŭčaty. Dałučajucca da choru).
Świet ludzki i rusalny —
Ledź jašče paznawalny—
Nowy šlach dla istnieńnia adkryje —
Dzień sławy.
(Hulnia taho i hetaha świetu).

Kaniec.

Zaświr, 13.X.1922 h.

Закладайце Гурткі
Беларускага Інстытуту Гаспадаркі
і Культуры.

Да нас пішуць:

ДАВОЛІ СПАЦЬ—ПАРА ЎСТАВАЦЬ!

Цэрэбостынь, Стаўпэцкага пав. Няспрыяючая разьвіцьцю нашага народу чужацкая палітыка ў нашым краю, якая запанавала пасьля разгрому Беларуска-Украінскае-Літоўскай дзяржавы, закалыхала наш народ у сьпячку—цемру. З гэтага летаргічнага сну і да гэтай пары ня ўсюды яшчэ прачынаюцца беларусы. У нашай вёсцы большасьць яшчэ сьпіць покатам. Прачнуўшыся людзі і атросшыся ад сьпячкі пачынаюць будзіць сьпячых. На голас будзячага — беларус уставай, даволі спаць, пара ўставаць, — чуюцца адказы праз сон сьпячых людзей: — мы рускай веры, у нас польская вера і мы польскія мужыкі, рускія хрэст'яне і іншыя недарэчнасьці.

Браты, мы ня рускай веры, а мы праваслаўныя. У нас вера ня польская, а каталіцкая. Вераў як рускай так і польскай няма на сьвеце. Гэты назоў праваслаўя рускай верай накінула нам расейская палітыка, а каталіцтва верай польскай назвала ў нас польская палітыка. Маскалі праз царкву праваслаўную стараліся нас перарабіць на расейцаў, а палякі праз каталіцкі касьцёл імкнуліся нас апалячыць. Мы ня рускія і не палякі, бо мы беларусы, а вера ў нас або праваслаўная або каталіцкая. Назоў—„мужыкі" або „крэст'яне"—гэта назоў клясы сялянскай, якая была калісь паняволена расейскімі і польскімі панамі.

Нясьведамасьць нашая нацыянальная і называньне сябе такімі назовамі гэта—нішто іншае, як сьляцы грубой палітыкі і несправядлівасьці над нашым народам.— Гэта раны тых зьдзекаў над народам, якія нам трэба залячыць, каб яны не разгнівіліся і не заражалі народнага арганізму. Ад гэтых ранаў нам трэба лячыцца, каб ня ўмерці.

Дык даволі спаць— пара ўставаць і лячыць свой народны арганізм. Закладайма свае беларускія культурна-прасьветныя арганізацыі, праз якія ўзмоцнім народны дух і залечым гістарычныя раны. Праз сьведамасьць і арганізацыю паправім і свой цяжкі лёс.

С. А.

Дэфэнзыўная напасьць з-за вугла.

„Беларускі Звон" (№ 10, 30-IV с. г.) зьмясьціў пісьмо (натуральна бяз прозьвішча!) нейкага быццам „бацькі", у якім чыста па жандарску дамагаецца выкінуць з Віленскай Беларускай Гімназіі доўгалетняга вучыцеля каталіцкай рэлігіі ў ёй кс. Ад. Станкевіча—за тое, што „Бел. Звону" не падабаецца палітыка „Беларускай Крыніцы", за якую чамусьці мае быць адказны той-жа кс. Ад. Станкевіч, які з гэтай часопісяй разстаўся ўжо пара гадоў таму,—ад арцыбіскупскай забароны. Ды сапраўдныя рэдактары „Бел. Звону" (Луцкевіч і Астроўскі) гэта самі добра ведаюць, але ўсёроўна якімі спосабамі (этыка для гэтых паноў ня існуе) — жадаюць кс. А. Станкевіча ў гімназіі пазбыцца. Залеташняга году, гэтай самай парой, рабілася, тое самае іншай дарогай, але гэта не ўдалося.

Дык аб што-ж ідзе? Што п. п. Луцкевіч і Астроўскі маюць да кс. Станкевіча. Вось-жа для паноў Астроўскіх і Луцкевічаў кс. А. Станкевіч непажаданы затым, што ён ня йдзе з імі на ніякія палітычныя афэры, а чэсна і адкрыта бароніць гімназію,—каб яна была сапраўды толькі школай, а не экспозытурай якойнебудзь палітыкі. Узноў-жа для такога вучыцеля Віл. Бел. Гімназіі, як п. А. Луцкевіча, які самавольна адчыняў падабранымі ключамі (пры дапамозе аднаго грамадзяніна) чужы прыватны пакой і адтуль забраў уласьніка пакою прыватную карэспандэнцыю і іншыя дакуманты,—само чэснае выкладаньне рэлігіі і яе вызнаваньне ёсьць найгоршай палітыкай. Хто знае п. Луцкевіча, дык добра ведае, што адносіны яго да Бога, да рэлігіі, асабліва да каталіцтва — гэта адносіны сатаны.

Урэшце, каб у Віл. Беларускай Гімназіі замест ксяндза беларуса быў паляк, як гэта ёсьць у Вуч. Сэмінарыі ім. Ф. Багушэвіча, паном гэтым так-жа не перашкаджала-б; ім гэта аплацілася-б.

Дзеля дабра школы і ейных гадунцоў ня будзем тут расьпісваць аб усіх „здольнасьцях пэдагагічных" і тых „узгадаваўчых кваліфікацыях", якімі адзначаюцца Луцкевіч і Астроўскі.

Здаецца нам, што гэная сапраўды дзікая з-за вугла напасьць вучыцялёў-рэдактароў (яны-ж не з анальфабэтаў) „Бел. Звону" на кс. А. Станкевіча—гэта толькі прыгрыўка да далейшай ігры, не канечне стройнай, да якой мы будзем уважна прыслухоўвацца і ў меру патрэбы будзем магчы на старонках нашай часопісі служыць грамадзянству фактамі і прозьвішчамі аб характары адносінаў гэтых паноў да гімназіі, да ўзгадаваньня моладзі і да тых вучыцялёў, якія ня йдуць з імі на ніякія камбінацыі.

Характэрная прытычка. У тым-жа № 10 „Бел Звону" знаходзім нясмачную свае някультурнасьцяй зацемку а пад адрасам таго-ж кс. А. Станкевіча, пад загалоўкам „Ксяндзоўская цэнзура" твораў Ф. Багушэвіча". Справа ў тым, што кс. А. Станкевіч, пры апрацаваньні выданых Б.І.Г.і К. твораў Патрыярхі бел. адраджэньня Ф. Багушэвіча, у 30-ыя ўгодкі сьмерці ягонай, прапусьціў некалькі радкоў, абражаючых эстэтычнае і этычнае пачуцьцё чытача. Вось-жа Луцкевічы і Астроўскія, замест быць удзячнымі кс. А. Станкевічу,— непрызваіта лаюць яго за гэта і дэманстрацыйна перадрукоўваюць тое прапушчанае нясмачнае месца. Ці гэта не ад збытку пэдагагічных кваліфікацыяў?

Ваенны лгун (№ 2).

Хэ, хэ, хэ, хэ!... Ці быў хто з вас на вайне? Ды, гдзе вам быць! (Махае рукой).

Вот я — саўсім другое дзела: я на вайне пабываў, гора павідаў; ня то, што пораху, але праклятых газаў панюхаў і, як бачыце, жыў і здароў, чаго і вам жадаю ад Геспада Бога! (Пстрыкае пальцамі і пахаджывае па сцэне).

Вайна, браты мае, го-го! Гэта ня то, што ў хаце сядзець і боб лушчыць. Хэ, хэ, хэ!..

Вайна — то бура і гром, пярун і маланка, агонь і сьмерць, і ўсё такое... Вось, што значыць вайна! Ды яшчэ дзесяць разоў больш. Тут, брат, цябе б'юць, тут рэжуць, паляць агнём, рвуць на кускі, засыпаюць зямлёй, ці жалезам (усё роўна!), а ты йдзеш, ці ляціш сабе наперад і аб нішто ня дбаеш. Браткі мае, колькі разоў я быў забіты! ай, ай, яй!... ну, але аб гэтым посьле.

Дык вось мы йдзём на фронт. Фронт, мае мілыя, гэта ёсьць два шнуры салдатаў, што хочуць адны другіх перацягнуць на свой бок. Колькі там мы рабілі штукаў, дык і пералічыць немагчыма! Кожны салдат строіць сабе зямлянку, а ўночы адзін другому сьвеціць у вочы; перакідываемся сабе жалезнымі мячыкамі, або абсыпаемся гарохам. А тая машынка, што сее гарох, цэлымі днямі ўсё сакоча: „пуль, пуль, пуль!" і называецца „пулямёт."

Аднак-жа горш за ўсё — гэта віраплааны. Надаелі яны нам, горш як каршун курам: ну, проста, няма куды падзецца. Толькі рана ўстанеш, пачнеш ануччу на бот накручываць, аж ужо і чуеш: „трррр!..." (паказывае і вядзе рукой па небе). „А бадай табе так у жываце бурчэла, як ты нам у вушах бурчыш!" Уцярэбіцца, гад палавы, у хмару; выбярэ сабе дзюру ў небе, і сядзіць у хмары, як гадзіна ў кусьце; узложыць акуляры і паглядае адтуль. А мы — хто куды! Ен-жа так усё відзіць, што навет угледзіць (сьцішыўшы голас і прылажыўшы руку да вуснаў)... белую блаху ў цябе за каўняром... і лупіць тагды ў цябе зьверху, як у бубен. А ты пападзі ў яго зьнізу, калі хочаш...

Адзін раз, як узьляцеў такі віраплан над нашымі акопамі, дык цэлая наша армія ў яго страляла. А ён нічога: бурчыць і дуе па нас. Дык нашая рота ўзяла яго на сваю адказнасьць: вот прынесьлі нам два цэбры куляў і мы сталі страляць. Выстралялі ўсе і... нічога! Тагды выступіў я да самага палкоўніка і кажу: „Ваша высокародзе! дайце мне яшчэ адзін цэбар куляў, дык я яго здыму." „Ну, ён кажа: бяры! толькі глядзі"... Але я ведаю, што ў віраплане галоўная сіла скрыта ў перапыльніку, што цягне цэлую машыну. Я і стаў ў яго цэліцца. Немец зара гэта падмеціў і фырт! Адкруціў віраплан да мяне хвастом. Іншыя салдаты стралялі ў крыльлі або ў хвост: крыльлі, праўда, пасіткавалі, але што з таго? Вось я, як даў у перапыльнік, дык віраплан ад пятай кулі, гляджу, куліксь! дагары нагамі, і перавярнуўся. Ды і немец хітры: ногі падкорчыў і меціцца каб зваліцца нам на галовы —ледзь я пасьпеў закрыцца лапаткай.

Слаўная, праўду кажучы, жыцьцё на фронце! Тут чалавек жывеш-гніеш, а там мы, бывала, як дзеці качаемся ў пясочку. А весела, дык проста вытрываць ня можна!

Трохі больш амбарасу — гэта атака. І то, як прывыкнеш, дык нічога-такога. Яшчэ як мы атакуем, дык тагды крыху горш, бо трэба бачыце, ляцець угалёп і можна лёгка паваліцца... а тут немец наскочыць, ды на мейсцы цябе і прыкуёчыць; або напусьціць на цябе газу з манеркі .. ну, і ты, знакам тым, капут!

Але, як немец атакуе, дык тагды саўсім добра: я сяджу сабе ў акопе і чакаю. Аж тут вось налятае немец і глядзіць на мяне, як баран на цымус, а я да яго пааўстрыяцку: „Ну, вазокст?" Ён тут да мяне з бомбай, а я кажу: „Панюхай ты воўчае мяса, чым гэта пахне!" Ды як шпурну яму штыхом пад нос... Немец, знакам тым, драла — я за ім; за мной цэлая рота, а за ротай — наш батальён; за батальёнам ужо цэлы полк, а за палком мой таварыш, Мікіта, што астаўся на задзе... ляціць і крычыць на мяне: „Пачакай, каб цябе паляруш!" Я гэта здуру аглянуўся, аж той немец, і чуць-чуць мяне ня сшыб з ног гранатай. Але я ў пару схамянуўся і гоп на бок! Граната на Мікіту, а Мікіта ўжо не пасьпеў адскочыць, дык, бедненькага, на дзьве палавіны і разарвала...

Посьля дахтары тры дні сшывалі, а наш цэлы полк, гледзячы, плакаў па ім, як па родным бацьку, бо і добры салдат быў Мікіта... Бывала, хто як хто, а Мікіта... ну, але аб гэтым посьле...

Але і немцу таму прышлося дрэнна: разгарэлася ўва мне кроў і я ўжо ня помніў, што са мной робіцца, — я парнуў яго штыхом, дык ён, гад, аж закашляў крывёю. Глянуў я на яго, дык мне ўжо і злосьць адляцела; думаю: чалавек — мой брат...Дык кажу: „Ідзі ты, паскуда, к манахам! А посьле думаю: Не! вазьму яго лепш у плен. Ну, і ўзяў.

А посьле мы далей за немцамі, а немцы драла: як сталі мы іх дуць — ляцім і крычым: „Урра-а, каб цябе халера, уррра-а!.." Дык запёрлі мы іх аж пад самага хранцуза: хранцуз адтуль, а мы адгэтуль, дык як сталі дуць... дулі, дулі, дулі... Але і немец хітры, каб яму дна ня было! зара выдумаў машыну, што з аднаго канца страляе, а з другога газ пушчае... Мы, ведама, прывыкшы да рознага духу, дык нам нічога, — от толькі чхалі; а хранцузы, народ далікатны, дык тыя... фу, няма чым хваліцца!... Ото-ж мы думаем сабе: „пі, пі, пі, пі—і!" відаць, што мусіць канец нам будзе і ўжо пачалі мы расьпісывацца на мір. Але хранцуз ня хоча; кажа: „чакайце, я маю новую машыну." І зара яе паставіў. Браты мае! вось быў сьмех: як толькі немец пусьціў газ, дык хранцуз як дзьмухне, дык увесь той дух прэ немцу назад... А амэрыканец выдумаў такія „катанкі," што як пакоціцца па палёх, па равох, па рэках... гдзе роўна, там ён пехатой ляціць, а гдзе перашкода, там на скрыдлы падыймаецца і дуе немца чым пападзе! Дык немец усё газам гадзіць: запрудзіў цэлы сьвет— рыба пагінула па рэчках і селядцы па бочках, папсуў нам у складах усе кансэрвы!

Давай і мы думаць штоколечы для абароны: вось і выдумалі ад газаў такія сетачкі — як ад камароў; нацягнеш на вочы і віякіх газаў не баішся. А такія густыя, што пальца нігдзе не праткнеш; толькі і ёсьць адна дзюрачка для носа, а другія для папяросы.

Ну, што? цікавая вайна, га? Я-ж і на пачатку так казаў! Вось яно як! Хэ, хэ, хэ!...

В. А.

Рэдактар Янка Пазьняк. Бел. Друк. ім. Фр. Скарыны, Вільня. Выдавец А. Шутовіч